**М.М.Каралёў,** *дацэнт*

# КАФЕДРА МЕНЕДЖМЕНТУ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ Ў СТРУКТУРЫ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ РАБОТНІКАЎ КУЛЬТУРЫ

Сучасная сацыяльна-культурная сітуацыя, адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры патрабуюць падрыхтоўкі для гэтых мэт высокакваліфікаваных кадраў. Такія кадры імкнецца рыхтаваць кафедра менеджменту сацыякультурнай сферы (СКС) у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Трэба адзначыць, што гэтая кафедра з'явілася адной з першых у падрыхтоўцы менеджэраў для галіны культуры ў нашай краіне.

Аналізуючы вопыт функцыянавання кафедры менеджменту СКС, можна канстатаваць, што сёння кафедра з'яўляецца адносна самастойным, жыццяздольным арганізмам, які актыўна развіваецца, пастаянна засвойвае тэорыю і практыку сацыякультурнай дзейнасці, укараняе новыя адукацыйна-выхаваўчыя тэхналогіі, пашырае сувязі з іншымі навучальнымі ўстановамі і арганізацыямі, актыўна ўключаецца ў распрацоўку і ажыццяўленне сацыякультурных праектаў і праграм на рэгіянальным, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях.

Вучэбны план кафедры ўключае наступныя дысцыпліны:

– менеджмент у сферы культуры;
– маркетынг і рэклама ў сферы культуры;
– фінансаванне і падаткаабкладанне ў сферы культуры;
– інавацыйны менеджмент;
– асновы прадпрымальніцтва;
– бухгалтарскі ўлік і аўдыт;
– менеджмент у сферы музычнай культуры;
– замежны менеджмент;
– справаводства;
– драматургія і рэжысура адпачынкавых праграм;
– краязнаўства і музейная справа;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– святочна-абрадавая дзейнасць;
– гісторыка-культурная спадчына;
– сацыяльна-культурная дзейнасць.

Гэты план у дастатковай ступені забяспечвае сучасных студэнтаў спецыялізацыі неабходнай сістэмай ведаў, практычных уменняў і навыкаў як будучых спецыялістаў у галіне культуры.

Эфектыўнасць вучэбнага працэсу забяспечваецца распрацаванымі праграмамі.

Значна актывізавалася ў апошні час навукова-даследчая дзейнасць выкладчыкаў кафедры. Паспяхова абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці «тэорыя, методыка і арганізацыя сацыякультурнай дзейнасці», выдадзены манаграфіі «Мастацка-творчая дзейнасць дзяцей-інвалідаў (пытанні сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі)», «Забеспячэнне якасці функцыянавання аўтаматызаваных сістэм». Агульны аб'ём публікацый выкладчыкаў кафедры складае больш за дзве з паловай тысячы друкаваных старонак, уключаючы навуковыя артыкулы, матэрыялы і тэзісы канферэнцый, семінараў, інфармацыйна-метадычных даведнікаў і інш.

Выкладчыкі кафедры рэгулярна выступаюць на старонках міжнародных і рэспубліканскіх выданняў, а таксама ў сродках масавай інфармацыі.

Вучэбна-творчы патэнцыял кафедры ў значнай ступені вызначаецца наяўнасцю ў нашым калектыве вядомых дзеячаў мастацтва і культуры, у творчым арсенале якіх – вопыт работы ў тэатры, кіно, кінарэжысуры, галерэйна-выставачнай дзейнасці, у сферы музычнага мастацтва, святочна-абрадавай дзейнасці. Непасрэдна выкладчыкамі кафедры забяспечваецца навукова-тэарэтычная аснова правядзення шматлікіх сацыякультурных акцый. Выкладчыкі кафедры плённа ўдзельнічаюць у культурным жыцці краіны, аказваюць навукова-метадычную дапамогу ўстановам і арганізацыям сістэмы Міністэрства культуры, Федэрацыі прафсаюзаў, Міністэрства адукацыі. У ліку выкладчыкаў кафедры – члены міжнароднай арганізацыі клубаў ЮНЕСКА,

гільдыі кінаакцёраў, Саюза тэатральных дзеячаў, Саюза мастакоў, Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій, Жаночай лігі, члены метадычных саветаў пры абласных навукова-метадычных цэнтрах. Значная частка выкладчыкаў кафедры садзейнічае працэсу ўдасканалення прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў культуры, супрацоўнічаючы з абласнымі курсамі павышэння кваліфікацыі, Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры, факультэтам дадатковай адукацыі БДУ культуры. Па даручэнні рэктарата БДУ культуры выкладчыкамі кафедры забяспечвалася навукова-кансультацыйная дапамога ў правядзенні Рэспубліканскага семінара кіруючых работнікаў пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, парламенцкіх слуханняў па пытаннях развіцця народнай творчасці.

Новы этап у жыцці нашага грамадства вызначае новыя патрабаванні да ўсёй сістэмы падрыхтоўкі кадраў работнікаў культуры, распрацоўкі новых вучэбных праграм і планаў, новых спецыяльнасцей і спецыялізацый. Вызначаючы кірункі ў падрыхтоўцы кадраў для галіны культуры, калектыў кафедры зыходзіць з таго, што працэс навучання павінен быць зарыентаваны на глыбокую агульнагуманітарную і культуралагічную падрыхтоўку спецыялістаў па сусветных адукацыйных і прафесіянальных стандартах.

Падрыхтоўка спецыялістаў для сацыякультурнай сферы павінна адпавядаць наступным крытэрыям:

– веданне гісторыі і этапаў развіцця прафесіі, звязанай з арганізацыяй мастацкай культуры, вольнага часу і адпачынкам;

– веданне тэорыі і філасофіі культуры вольнага часу і кіравання;

– веданне чалавечых і прыродных рэсурсаў і іх улік ў арганізацыі вольнага часу;

– веданне рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных законаў і актаў і іх уздзеяння на дзейнасць у галіне культуры і вольнага часу;

– веданне прыроды і відаў вольнага часу, здольнасць да аналізу дзейнасці ўдзельнікаў вольнага часу;

– веданне тэхнічных прыёмаў забеспячэння вольнага часу;

– веданне механізму планавання праграмы развіцця, уключаючы выяўленне аб'ектыўных прынцыпаў, выбар зместу дзейнасці, вызначэнне стратэгічных перспектыў, забеспячэнне патрабуемых рэсурсаў і распрацоўку доўгатэрміновых планаў;

– веданне і выкарыстанне вялікай колькасці прыёмаў групавой і індывідуальнай дзейнасці ў сферы культуры і вольнага часу;

– усведамленне адказнасці ўстаноў культуры, мастацтва і вольнага часу ў рабоце з інвалідамі і асобымі групамі насельніцтва;

– магчымасць мяняць прыёмы, канцэпцыі вольнага часу, якія дазваляць прыняць удзел у культурна-займальнай дзейнасці асобным групам насельніцтва;

– веданне прынцыпаў і метадаў кіравання, уключаючы арганізацыю, планаванне, маркетынг і прафесійны ўзрост, фінансаванне, грамадскія адносіны, дзелавую практыку і працоўныя адносіны, прынянцце рашэнняў, рашэнне праблем, фарміраванне сацыяльна-псіхалагічнага клімату ў калектыве, веданне ролі і функцый адукацыі ў галіне культуры вольнага часу, мэты асноўных працэсаў і ўзаемасувязь даследчай працы і кіравання ў галіне культуры і вольнага часу.

Валодаючы інавацыйнымі тэхналогіямі арганізацыі сацыякультурнай і прадпрымальніцкай дзейнасці, ведамі менеджменту, маркетынгу, рэкламы, эканомікі, айчыннага і замежнага права, знешнеэканамічнай дзейнасці, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, замежнымі мовамі, менеджэр сацыякультурнай сферы павінен вырашаць пытанні развіцця культуры за кошт выкарыстання розных сродкаў фінансавання, матэрыяльных і чалавечых рэсурсаў.

Падрыхтоўка менеджэраў можа ажыццяўляцца на трох узроўнях: адміністрацыйным – у маштабе рэгіёна (вобласць, раён, горад) – выпускнік магістратуры; кіруючым – у маштабе ўстаноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры (дырэктар, адміністратар і інш.) – спецыяліст з вышэйшай адукацыяй; арганізацыйным – лідэр, арганізатар праграмы – бакалаўр.

Для высакаякаснай падрыхтоўкі спецыялістаў па гэтых кірунках прынята ў якасці прыярытэтнай такая мадэль адукацыі, якая пабудавана на метадалогіі і методыках, што забяспечваюць фарміраванне незалежнага светапогляду і развіццё творчых магчымасцей асобы. На першым этапе на працягу чатырох гадоў студэнт вывучае блок гуманітарных дысцыплін, яны даюць фундаментальную агульнакультурную і агульнапрафесійную падрыхтоўку і арыентуюць навучэнца на нацыянальную культуру. Гэта традыцыйныя дысцыпліны вышэйшых школ свету: сусветная і нацыянальная гісторыя, літаратура, гісторыя філасофіі, логіка, рыторыка, гісторыя культуры, мастацкая культура Беларусі, замежная мова і інш.

У той жа час студэнт атрымлівае і фундаментальную прафесійную падрыхтоўку ў межах спецыялізацыі па такіх прадметах, як сацыякультурная дзейнасць, менеджмент, маркетынг, рэклама ў сферы культуры, эканоміка і фінансаванне сацыякультурных праграм, інфарматыка і вылічальная тэхніка, прававыя асновы кіравання, кіраванне ў галіне культуры за мяжой і інш.

З трэцяга курса студэнт набывае суму спецыялізаваных ведаў, уменняў у рамках спецыялізацыі для дзейнасці ў пэўных сферах, галінах сацыякультурных устаноў.

Заканчваецца гэты этап навучання на чацвёртым курсе тэарэтычным даследаваннем па першым блоку дысцыплін і дыпломнай працай прыкладнога характару па даследаванні канкрэтнага вопыту. Пасля заканчэння дадзенага этапу навучання студэнт атрымлівае дыплом бакалаўра гуманітарных навук.

На апошніх курсах студэнт па асабістым жаданні выбірае для сябе вузкую спецыялізацыю:

– шоу-бізнес (менеджэр і прадзюсер канцэртна-відовішчных праграм),

– кіна-, відэапракат (прадзюсер, менеджэр кіна-, відэапракату),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– менеджмент культурнага турызму (менеджэр сферы турызму),

– спартыўна-аздараўленчы бізнес (менеджэр спартыўна-аздараўленчай дзейнасці),

– музейна-выставачная дзейнасць (менеджэр музейна-выставачнай дзейнасці),

– тэлебачанне, радыё і сродкі масавай інфармацыі (менеджэр тэлебачання і радыё),

– public relations – рэклама і грамадскія сувязі (менеджэр па рэкламе і public relations),

– прадзюсерства ў сферы выяўленчага мастацтва (прадзюсер галерэйнай справы),

– менеджмент міжнародных культурных сувязей (менеджэр па міжнародных культурных сувязях),

– менеджмент мадэльнага шоу-бізнесу (менеджэр мадэльнага шоу-бізнесу),

– менеджмент кіна-, відэавытворчасці (прадзюсер, менеджэр кіна-, відэавытворчасці),

– менеджмент грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў (менеджэр грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў),

– арганізацыя і методыка культурна-адпачынкавай дзейнасці (менеджэр культурна-адпачынкавай дзейнасці).

Сёння ў сваёй рабоце кафедра адмовілася ад не апраўдаўшых сябе стэрэатыпаў культурна-асветніцкай адукацыі. Значная ўвага надаецца адраджэнню нацыянальных формаў традыцыйнай культуры, усталяванню агульначалавечых каштоўнасцей.

У вучэбным працэсе актыўна выкарыстоўваюцца творчыя семінары. Эфектыўна працуюць праблемныя лабараторыі, мастацкія майстэрні і інш., ствараемыя пад перспектыўныя кірункі і канкрэтныя задачы.

Перагляд набору спецыялізацый, па якіх вядзецца навучанне ў ВНУ, абумоўлены не толькі сённяшняй сацыяльна-культурнай сітуацыяй, але і прагназіраваннем тэндэнцый функцыяніравання сацыякультурнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ